**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**
**Філалагічны факультэт**
**Кафедра беларускай літаратуры і культуры**

**Анатацыя да дыпломнай работы**
**Волчэк Таццяны Вадзімаўны**

# “Жанр санета ў творчасці А. Міцкевіча, Я. Купалы, М. Багдановіча, У. Жылкі: ад рамантызму да неакласіцызму”

**Навуковы кіраўнік Сінькова Людміла Дзмітрыеўна**

**2014**

# Рэферат

Ключавыя словы: САНЕТ, ЖАНР, ЛІТАРАТУРА, ПЕРАКЛАД, РАМАНТЫЗМ, СІМВАЛІЗМ, НЕАКЛАСІЦЫЗМ, НЕАРАМАНТЫЗМ, ЛІРЫЧНЫ ГЕРОЙ, ПАЭТЫКА.

Структура дыпломнай работы. Аб'ём дыпломнай работы складае 59 старонак. Даследаванне ўключае 2 главы і спіс выкарыстанай літаратуры.

Колькасць выкарыстаных крыніц літаратуры – 61.

Аб'ектам даследавання з'яўляецца санетарый Я. Купалы, М. Багдановіча, У. Жылкі, а таксама класіка польскай літаратуры беларускага паходжання А. Міцкевіча.

Мэта дыпломнага даследавання – прааналізаваць традыцыю беларускага санетапісання на матэрыяле дасягненняў беларускай паэзіі 10-20-х гг. ХХ ст., якая ў жанры санета засвоіла такія вядучыя стылі эпохі, як рамантызм, неарамантызм, сімвалізм, неакласіцызм.

Метады даследавання грунтуюцца на прынцыпах апісальнага, культурна-гістарычнага літаратуразнаўства, а таксама цэласнага аналізу мастацкага твора. Метадалагічную аснову працы складаюць працы такіх айчынных і замежных гісторыкаў і тэарэтыкаў літаратуры, як Я. Барычэўскі, І. Замоцін, М. Конрад, А. Луцкевіч (Навіна), Р. Бярозкін, У. Конан, А. Лойка, У. Мархель, Г. Паспелаў, Л. Тарасюк, Т. Чабан, У. Сенькавец, В. Рагойша, Г. Адамовіч, І. Багдановіч і інш.

Атрыманыя вынікі. У дыпломнай працы разгледжаны санеты Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Уладзіміра Жылкі і Адама Міцкевіча ў кантэксце станаўлення і развіцця гэтага жанру ў еўрапейскай літаратуры, а таксама прааналізаваны вобраз лірычнага героя ў творах; вылучаны два адрозныя падыходы ў развіцці санета на падставе рыс, уласцівых неакласіцызму, і асаблівасцей, характэрных рамантызму, сімвалізму; разгледжана традыцыя захавання санетнага канону; выяўлены прыёмы эмацыянальнага ўздзеяння на чытача; адзначаны мастацкія дасягненні беларускага санета ў кантэксце сусветнай паэзіі.

Рэкамендацыі па выкарыстанні. Матэрыялы працы могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе на філалагічных факультэтах вышэйшых навучальных устаноў пры чытанні курсаў "Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя", "Тэорыя літаратуры", пры чытанні спецкурсаў, правядзенні

семінарскіх заняткаў па праблемах развіцця паэтычных жанраў, пры напісанні студэнтамі курсавых работ.

# Реферат

Ключевые слова: СОНЕТ, ЖАНР, ЛИТЕРАТУРА, ПЕРЕВОД, РОМАНТИЗМ, СИМВОЛИЗМ, НЕОКЛАССИЦИЗМ, НЕОРОМАНТИЗМ, ЛИРИЧЕСКИЙ ГЕРОЙ, ПОЭТИКА.

Структура дипломной работы. Объём дипломной работы составляет 59 страниц. Исследование включает 2 главы и список использованной литературы.

Количество использованных источников литературы — 61.

Объектом исследования является сонетарий Я. Купалы, М. Богдановича, В. Жилки, а также классика польской литературы белорусского происхождения А. Мицкевича.

Цель дипломного исследования — проанализировать традицию белорусского сонетописання на материале достижений белорусской поэзии 10-20-х гг. ХХ в., которая в жанре сонета усвоила такие ведущие стили эпохи, как романтизм, неоромантизм, символизм, неоклассицизм.

Методы исследования базируются на принципах описательного, культурно- исторического литературоведения, а также целостного анализа художественного произведения. Методологическую основу работы составляют работы таких отечественных и зарубежных историков и теоретиков литературы, как Я. Баричевский, И. Замотин, Н. Конрад, А. Луцкевич (Навина), Г. Берёзкин, В. Конон, А. Лойко, В. Мархель, Г. Поспелов, Л. Тарасюк, Т. Чебан, В. Сенькавец, В. Рагойша, Г. Адамович, И. Богданович и др.

Полученные результаты. В дипломной работе рассмотрены сонеты Максима Богдановича, Янки Купалы, Владимира Жилки и Адама Мицкевича в контексте становления и развития этого жанра в европейской литературе, а также проанализирован образ лирического героя в произведениях; выдвинуты два отличающихся подхода в развитии сонета на основании черт, присущих неоклассицизму, и особенностей, характерных романтизму, символизму; рассмотрена традиция сохранения сонетного канона; выявлены приёмы эмоционального воздействия на читателя; отмечены художественные достижения белорусского сонета в контексте мировой поэзии.

Рекомендации по использованию. Материалы работы могут быть использованы в учебном процессе на филологических факультетах высших учебных заведений при чтении курсов “История белорусского литературы ХХ века”, “Теория литературы”, при чтении спецкурсов, проведении

семинарских занятий по проблемам развития поэтических жанров, при написании студентами курсовых работ.

# ABSTRACT

Keywords: SONNET, GENRE, LITERATURE, TRANSLATION, ROMANTICISM, SYMBOLISM, NEOCLASSICISM, NEOROMANTISM, LYRICAL HERO, POETICS.

The structure of the work. The volume of the thesis is 59 pages. The study includes 2 chapters and a list of references.

The number of used literature sources: 61.

The object of study is sonnetary of Y.Kupala, M. Bogdanovich, V. Zhylka, and Adam Mickiewich, the classic of Polish literature of Belarusian origin.

The purpose of diploma thesis is to analyze the Belarusian sonnet tradition on the material of the Belarusian poetry achievements of the10-20-ies of the XX century. Belarusian sonnet acquired the typical styles of the century such as romanticism, neoromanticism, symbolism, neoclassicism.

Our method is based on the principles of descriptive, cultural and historical literature, as well as a holistic analysis of the artwork. Methodological basis of thesis is works of Russian and foreign historians and literary theorists like J. Barichevsky, I. Zamotin, N. Conrad, A. Lutskevich (Navina), G. Beryozkin, V. Conan, A. Loika, V. Marhel, G. Pospelov, L. Tarasyuk, T. Cheban , V. Senkavets, V. Ragoysha, G. Adamovich, I. Bogdanovich, etc.

Results. The sonnets of Maxim Bogdanovich, Yanka Kupala, Vladimir Zhylka and Adam Mickiewich in the context of the formation and development of this genre in the European literature have been analyzed; the image of the lyrical hero in the works has been studied; two different approaches in the development of the sonnet on the basis of features inherent to neoclassicism and features characteristic of romanticism, symbolism have been put forward; canon sonnet tradition have been considered; techniques producing the emotional impact on the reader have been identified; the artistic achievements of the Belarusian sonnet in the context of world poetry have been revealed.

Recommendations for use.The resultsof the diploma thesis can be used at the philological faculty for courses “The History of the Belarusian literature of XX century“,“Theory of literature”, seminars on the development of poetic genres.